# ГЭТА РЭАЛЬНА!

## Што робіць са з'явамі і рэчамі творчае ўяўленне



*Леанід Гоманаў «Вадаспад» (Дзю джай гоу, Кітай), 2012 г.*

**У кожнага чалавека сваё адчуванне рэальнасці. Мастакам дадзена здольнасць выяўляць яе ў межах твора. Ці асобнай выстаўкі. Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» прадставіла выставачны праект «Вобраз рэальнасці».**

У ім узялі ўдзел Леанід Гоманаў, Мікалай Андруковіч, Аляксандр Кошалеў, Аляксандр Сяліцкі і Аксана Аракчэева. Аўтары спалучылі два падыходы да рэалізацыі канцэпцыі: першы заключаецца ва ўспрыманні рэальнага свету, які існуе аб'ектыўна, незалежна ад чалавека, другі варыянт — рэчаіснасць з'яўляецца суб'ектыўным спараджэннем свядомасці, непарыўна звязаным з самой асобай, асаблівасцямі яе дзейнасці.

— У мастацтве рэальнасць — асноўная тканіна твора, якая адлюстроўвае адну з яе шматлікіх граняў, — адзначае куратар выстаўкі, мастацтвазнаўца Ксенія Сяліцкая-Ткачова. — Менавіта ў мастацкім вобразе адбываецца зліццё разрознenага матэрыялу рэчаіснасці і асобы аўтара, нараджаецца ўнікальная карціна падзеі, чалавека альбо свету. На выстаўцы прадстаўлены творы мастакоў, для якіх зыходны імпульс у творчасці — захапленне рэальнасцю з яе бясконцай разнастайнасцю і багаццем з'яў, формаў, фарбаў. Кожная праца ўяўляе сабой непаўторны вобраз навакольнага свету, які нясе ўражанні, пачуцці і думкі аўтара. Многія карціны адлюстроўваюць вечную эстэтычную каштоўнасць прыроды, заўсёды новай і дзіўнай у пастаяннай зменлівасці.

Рэальнасць, якую паказвае Леанід Гоманаў, ствараюць пейзажы, ціхія і спакойныя. Да такіх карцін



*Мікалай Андруковіч «Нарачанскія сосны», 2013 г.*

хочацца падыходзіць у момант, калі трэба застацца сам-насам са сваімі думкамі. Горы, туман, вадаспады — з'явы прыроды, якімі немагчыма не захапляцца. Мікалай Андруковіч таксама адлюстроўвае пейзажы, толькі беларускія. Тут у думках можна павандраваць ля Нарачы, зайсці ў глыбіню лесу. Творы аўтара падштурхоўваюць паразважаць пра адзінства чалавека і прыроды. А вось партрэты Аляксандра Сяліцкага можна разглядаць як прысвячэнне блізкім. Карціны напісаныя ў цікавай творчай манеры сучаснага рамантызму і пераплятаюцца з творчасцю знакамітых майстроў мінулага.



*Аляксандр Кошалеў «Вясна на двары ў Канстанцінаўны», 2010 г.*

Важную частку экспазіцыі складаюць нацюрморты. Як адзначыла куратар выстаўкі, гледзячы на іх, паступова пранікаеш у ціхае жыццё рэчаў. У нацюрмортах аўтары з асаблівай выразнасцю захавалі матэрыяльнасць, адчувальнасць, фактурнасць прадметаў, якія ў кантэксце твораў становяцца эстэтычна значнымі аб'ектамі рэчаіснасці.

Кожная работа пражытая мастакамі да апошняй дэталі. Творцы ў сваёй рэальнасці пазбягаюць жорсткасці і цынічнасці, аддаюць перавагу святлу, дабрыні, што ўдасканаліць душу, дапаможа знайсці спакой. Падчас экспанавання выстаўкі ў галерэі «Універсітэт культуры» Ксенія Ткачова зладзіць некалькі спецыяльных экскурсій і распавядзе пра кожнага мастака і яго творчыя арыенціры.

**Вікторыя АСКЕРА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГ